# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі Пышкала Кацярыны Рыгораўны

**«Саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі (1772-1861 гг.)»,**

прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Стаўленне да дзяцінства і дзяцей, асабліва да сірот, з'яўляецца неад'емным крытэрыям сацыяльнай сталасці грамадства на любой стадыі яго развіцця. Вывучэнне эвалюцыі інстытута апякунства на беларускіх землях дазволіць узнавіць поўную карціну арганізацыі догляду дзяцей-сірот, паказаць асаблівасці прымянення спецыфічных форм выхавання непаўналетніх, якія засталіся без апекі бацькоў, у залежнасці ад іх сацыяльнай прыналежнасці, абагуліць вынікі існавання сіроцкіх выхаваўчых устаноў, зыходзячы з прывілеяванага або непрывілеяванага статусу дзіцяці-сіроты. Напрацаваныя традыцыі ў інстытуце апякунства над дзецьмі-сіротамі ў XIX ст. могуць быць цікавымі для сучаснага беларускага грамадства спробамі вырашэння супярэчнасцяў міжузроўневага ўзаемадзеяння ў сферы дзіцячага догляду, апрабацыяй сістэмы рацыянальнай дапамогі і падтрымкі, сутнасць якой заключаецца ў пабудове адносін паміж апекунамі і сіротамі, стварэнні пэўных сацыяльна-бытавых умоў жыцця, падрыхтоўцы да самастойнай працоўнай дзейнасці. У гэтай сувязі актуальнасць тэмы дысертацыйнага даследавання Кацярыны Рыгораўны Пышкала не выклікае сумненняў.

Афармленне аўтарэферата цалкам адпавядае патрабаванням Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь. У ім выразна прадстаўлена структура дысертацыі, якая дазваляе абгрунтаваць атрыманыя вывады. Дысертацыя складаецца з уводзінаў, дзе адзначаецца навуковая актуальнасць тэмы, агульнай характарыстыкі работы, дзе фармулююцца мэта і задачы, аб'ект і прадмет дысертацыйнай працы, утрымліваецца інфармацыя пра сувязь з навуковымі праграмамі, асабісты ўклад саіскальніка, апрабацыю дысертацыі, апублікаванасць і выкарыстанне вынікаў даследавання, а таксама змяшчаюцца пяць палажэнняў, вынесеныя на абарону.

У першай главе «Гістарыяграфія, крыніцы і метадалогія даследавання» праводзіцца аналіз крыніцазнаўчага масіву, гістарыяграфіі праблемы і вызначаецца метадалогія даследавання. Нават скарочаны тэкст аўтарэферата ўпэўнівае, што дысертацыя абапіраецца на значную крыніцазнаўчую базу, гістарыяграфічны агляд сведчыць пра добрае знаёмства саіскальніцы са станам даследаванняў па дадзенай праблеме, а сама дысертацыя К.Р. Пышкала арганічна ўключана ў навуковы кантэкст.

Другая глава «Прававое рэгуляванне па забеспячэнні інтарэсаў дзяцей-сірот» прысвечана заканадаўству, якое абгрунтоўвала функцыянаванне саслоўнай апекі над сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг. Саіскальніца зрабіла акцэнт на вывучэнні двух нормаў права, якія мелі юрыдычную сілу на тэрыторыі Беларусі ў разглядаемы час, – Статута 1588 г. (тэрмін заканчэння яго дзеяння ў галіне грамадзянскага права аўтар вызначае

1835 годам) і асноўных заканадаўчых дакументаў Расійскай імперыі, что дазволіла параўнаць ступень дасканаласці заканадаўства ў галіне палітыкі апякунства над дзецьмі-сіротамі ў розныя перыяды.

Трэцяя, чацвертая і пятая главы раскрываюць асаблівасці апекі над сіротамі ў межах розных саслоўяў – дваранскага, гарадскіх абывацеляў, духавенства, сялян. З тэксту аўтарэферата вынікае, што К.Р. Пышкала ў дысертацыі спыняецца таксама на вылучэнні рэгіянальнай спецыфікі дзейнасці асобных саслоўных органаў апекі і папячыцельства, створаных у Расійскай імперыі як дадатак да дзяржаўнай сістэмы падтрымкі дзяцей-сірот, – дваранскіх апек і гарадскіх сіроцкіх судоў.

Асноўныя вывады дысертацыйнага даследавання, прыведзеныя ў аўтарэфераце, добра абгрунтаваныя і адпавядаюць пастаўленай аўтарам мэце і задачам. Палажэнні і вынікі дысертацыі К.Р. Пышкала знайшлі дастаткова поўнае тэматычна рэпрэзентатыўнае адлюстраванне ў 13 навуковых працах, выкананых аўтарам самастойна, 4 артыкулах ў часопісах і зборніках, якія адпавядаюць п. 19 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь.

Вынікі дысертацыйнай працы К.Р. Пышкала маюць як навуковае, так і практычнае значэнне. Асноўныя палажэнні даследавання дазваляюць глыбей асэнсаваць сацыяльную палітыку ў дачыненні да найбольш неабароненай катэгорыі насельніцтва – дзяцей-сірот у 1772 – 1861 гг. на тэрыторыі Беларусі. Нягледзячы на тое, што вывады дысертацыі ўжо прайшлі апрабацыю ў адукацыйным працэсе, пра што сведчаць акт аб укараненні вынікаў даследавання ва ўстанове адукацыі «Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі», яе матэрыялы і далей могуць быць выкарыстаны для рэалізацыі новых навуковых праектаў, а таксама пры напісанні абагульняючых прац па гісторыі Беларусі, падрыхтоўцы раздзелаў падручнікаў, праграм і спецкурсаў.

Такім чынам, змест аўтарэферата паказвае, што дысертацыя Кацярыны Рыгораўны Пышкала «Саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі (1772-1861 гг.)» адпавядае патрабаванням, што прад'яўляюцца да падобнага роду кваліфікацыйных навуковых прац, а сам аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Дацэнт кафедры гісторыі
Беларускага нацыяналнага
тэхнічнага ўніверсітэта,
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт А.В. Лепеш

Верно
Зам. начальника
управления по работе
с персоналом И.В. Анастасюк
«02» 03 20[illegible]

Белорусский национальный технический университет
Управление по работе с персоналом
Минск